УДК 331.105

# Сацыяльна-працоўныя адносіны: паняцце і тыпалогія

Дубовік А.А.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Адносіны ў сферы працы трактуюць за мяжой традыцыйна вузка, інструментальна, выкарыстоўваючы тэрміны *industrial relations* і *labour relations*, у марксісцкай жа тэорыі яны атаясамліваліся з вытворчымі адносінамі. У айчыннай сацыяльна-эканамічнай літаратуры ў апошні час усё шырэй ужываецца катэгорыя «сацыяльна-працоўныя адносіны» (СПА), уласцівая сацыяльна арыентаванаму падыходу, які прызнае вялікі ўплыў соцыума на працоўны працэс. Пад СПА варта разумець сістэму грамадскіх адносін, узнікаючых паміж людзьмі ў працэсе працоўнай і іншых форм дзейнасці па прычыне іх удзелу ў грамадскай працы. Структура СПА шматгранная. Так, па прыродзе паходжання іх падраздзяляюць на матэрыяльныя (вытворчыя) і духоўныя (прававыя, палітычныя, этычныя і г.д.). Па механізму праяўлення, функцыянавання – на базісныя (вытворчыя, працоўныя) і надбудовачныя (прававыя, сацыяльна-псіхалагічныя і інш.). На аснове выдзялення аналагічных ці блізкіх для ўдзельнікаў сацыяльна-прафесійных задач СПА падраздзяляюцца на адносіны: уласнасці, у сферы занятасці, звязаныя з арганізацыяй вытворчасці і ўмовамі працы, з узнагароджаннем за працу, вырашэннем працоўных спрэчак, рэалізацыяй сацыяльных гарантый, павышэннем кваліфікацыі і г.д. Пры вывучэнні СПА з пункту гледжання іх рэгулявання дзяржавай і прафсаюзамі прадстаўляецца мэтазгодным выкарыстоўваць іменна такую структуру, так як яна ляжыць у аснове пабудовы працоўнага заканадаўства. СПА рэалізуюцца на розных узроўнях: лакальным, галіновым, нацыянальным, уключаюць як індывідуальныя ўзаемадзеянні (працадаўца – працаўнік), так і міжгрупавыя (аб’яднанне наймальнікаў – аб’яднанне прафсаюзаў).

СПА з’яўляюцца аб’ектам вывучэння розных сацыяльных навук. Вызначальнае значэнне для гістарычнага даследавання мае выдзяленне гістарычных тыпаў СПА (патэрналісцкі, партнёрскі, канкурэнтны, салідарны, субсідыярны, дыскрымінацыйны, канфліктны), характарыстыка іх у сферы працаўладкавання, аплаты працы, заключэння калектыўных дагавораў і пагадненняў, удзелу ў кіраванні вытворчасцю. Напрыклад, асноўныя навацыі НЭПа ў сферы працы заключаліся ў пераходзе ад працоўнай павіннасці да вольнага дагавору найму; ад пазаэканамічнага адміністрацыйнага прымусу да спалучэння матэрыяльнага і маральнага стымулявання працы; развіцці сістэмы калектыўных дагавораў, уяўляўшых сабой элементы сацыяльнага партнёрства. Аднак у СПА ў гэты перыяд пераважаў дзяржаўны патэрналізм.